# З ПАСТАНОВЫ СХОДУ КАМСАМОЛЬСКАГА АКТЫВУ

— Кіруючыся патрабаваннямі кастрычніцкага (1985 г.) Пленума ЦК КПСС, камітэтам камсамола, камсамольскім і прафсаюзным бюро факультэтаў узмацніць работу па выкананню пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні партыйнага кіраўніцтва камсамолам і павышэнні яго ролі ў камуністычным выхаванні моладзі», мабілізаваць юнакоў і дзяўчат на дастойную сустрэчу XXVII з'езда КПСС.

— Камсамольскаму і прафсаюзнаму актыву павысіць адказнасць за стан вучобы студэнтаў, стварыць непрымірымую абстаноўку да студэнтаў, якія праяўляюць недобрасумленныя адносіны да заняткаў, парушаюць дысцыпліну. Цэнтральнае месца ў гэтай рабоце павінна належаць вучэбнай групе. З гэтай мэтай:

— вывучыць вопыт арганізацыі рабочага часу выдатнікаў вучобы, якія ўмела спалучаюць заняткі з грамадскай работай, шырока прапагандаваць вопыт выдатнікаў вучобы, ленінскіх і імянных стыпендыятаў;

— камсамольскаму і прафсаюзнаму актыву неабходна мець канкрэтны аналіз бягучай паспяховасці і вучэбнай дысцыпліны ва ўсіх групах;

— лічыць, што член ВЛКСМ заслугоўвае строгага камсамольскага спагнання за пропускі заняткаў без уважлівых прычын;

— вучэбна-выхаваўчым камісіям за пропускі заняткаў без уважлівых прычын у колькасці 14 гадзін ставіць пытанне перад стыпендыяльнай камісіяй факультэта аб зняцці стыпендыі;

— за пропускі заняткаў без уважлівых прычын у колькасці 18 гадзін ставіць пытанне аб немэтазгоднасці знаходжання члена ВЛКСМ у ліку студэнтаў універсітэта.

— Камітэтам камсамола, камсамольскім і прафсаюзным бюро факультэтаў удасканальваць арганізацыю сацыялістычнага спаборніцтва акадэмічных груп, арганізавана завяршыць спаборніцтва камсамольцаў за права падпісаць рапарт XXVII з'езду КПСС.

— Настойліва ўдасканальваць контрпрапагандысцкую работу, узмацніць індывідуальную работу з маладымі людзьмі, якія паддаюцца ўплыву чужой нам ідэалогіі і маралі. Камітэтам камсамола, камсамольскім і прафсаюзным бюро арганізаваць навучанне камсамольскага і прафсаюзнага актыву навыкам вядзення контрпрапаганды праз лекцыі, гурткі і аб'яднанні.

— Камітэтам камсамола, камсамольскім і прафсаюзным бюро ўдзяляць больш увагі арганізацыі вольнага часу моладзі, настойліва шукаць і ўкараняць новыя яго формы. Узмацніць прапаганду здаровага ладу жыцця, барацьбу з п'янствам.

— Камітэту камсамола, камсамольскім арганізацыям выхоўваць у студэнцкай моладзі патрэбнасць у сістэматычным творчым авалоданні марксісцка-ленінскай тэорыяй, выпрацоўваць уменне прымяняць веды ў агітацыйна-прапагандысцкай рабоце.

Сумесна з выкладчыкамі кафедр грамадскіх навук шырэй укараняць на семінарскіх занятках па сацыяльна-эканамічных дысцыплінах актыўны абмен думкамі, абмеркаванне вынікаў студэнцкіх навуковых даследаванняў, цясней звязваць тэорыю з практыкай. Палепшыць якасць аператыўнага палітычнага выхавання, працягваць практыку правядзення палітычнага заліку.

— Шырэй выкарыстоўваць агітацыю, насценны друк. Развіваць самакіраванне ў вучэбных групах, інтэрнатах, прафкому студэнтаў разгледзець магчымасць пераводу студэнцкіх інтэрнатаў на самакіраванне.

*Дзве сістэмы—два лады жыцця*

## КАПІТАЛІЗМ: РАКЕТЫ ЗАМЕСТ ШКОЛ

Абмеркаванне праекта дзяржаўнага бюджэта ў кангрэсе ЗША вясной 1983 года, як заўсёды, праходзіла бурна. Спасылаючыся на ўяўную «савецкую пагрозу», урад патрабаваў дадатковых асігнаванняў на ваенныя мэты. Аднак некаторыя з кангрэсменаў бачылі пагрозу нацыянальнай бяспекі ў іншым — у стане амерыканскай адукацыі. Сенатар Д. Іноуэй, напрыклад, заявіў: «Праграма Рэйгана вядзе да аслаблення Амерыкі. Мы лічым, што праграмы, якія садзейнічаюць паляпшэнню адукацыі і аховы здароўя нашага народа, умацоўваюць нашу магутнасць».

Што ж у гэтай заяве: звычайны прыём парламенцкай барацьбы? Не, сенатар у многім меў рацыю. За пасляваенныя гады ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі пазіцыі ЗША ў свеце пастаянна слабелі паралельна з ростам іх ваенных расходаў. У 1950 г. на долю ЗША прыпадала 50% прамысловай вытворчасці капіталістычнага свету, а ў 1980 г. — усяго 34%. Па ўзроўню вытворчасці валавога нацыянальнага прадукта на душу насельніцтва ЗША з першага месца сярод капіталістычных краін перамясціліся на сёмае, а па тэмпах росту прадукцыйнасці працы яны адстаюць цяпер ад Японіі, Францыі, ФРГ. У той жа час ваенныя расходы імкліва раслі, асабліва пры адміністрацыі Рэйгана, калі яны павялічыліся амаль удвая. Так, у 1982 г. іх доля ў федэральных расходах складала 60%, у 1985 г. — ужо 78%. Гэта азначае, што на сацыяльныя і іншыя патрэбы накіроўваецца прыкладна 1/5 расходнай часткі дзяржаўнага бюджэту.

Карыслівымі інтарэсамі ваенна-прамысловага комплексу тлумачацца многія з бедстваў сучаснай сістэмы адукацыі ў ЗША. Нацыя, якая ў канцы XIX ст. была адной з найбольш адукаваных у свеце і мела сістэму бясплатнай сярэдняй і пачатковай школы, сутыкнулася сёння з праблемай растучай непісьменнасці. Прэзідэнт Рэйган быў вымушаны прызнаць, што прыкладна 13% 17-гадовых амерыканцаў практычна не ўмеюць пісаць і чытаць, а сярод нацыянальных меншасцей гэты паказчык дасягае нават 40%. Па афіцыйных даных, якія адносяцца да пачатку 80-х гадоў, у ЗША налічваецца больш 30 мільёнаў дарослых грамадзян, якія зусім не ўмеюць чытаць. Прыкладна яшчэ столькі ж амерыканцаў чытаюць па складах. Гэта і не дзіўна, калі ўлічыць, што дзяржаўныя асігнаванні на ўтрыманне кожнага школьніка ў 64 разы меншыя за тыя сродкі, якія выдзяляюцца на кожнага салдата.

Праблема непісьменнасці ў ЗША і ў іншых капіталістычных краінах — гэта перш за ўсё праблема беднасці сярод працоўных. Многія школьнікі вымушаны пакідаць вучобу дзеля кавалка хлеба. Такіх, як сведчыць газета «Дейлі уолрд», штогод налічваецца каля мільёна чалавек. Сталеючы, яны аказваюцца не ў стане атрымаць добрую работу ў сувязі з недахопам адукацыі. Кола замыкаецца. Відавочна, што выхадцам з такіх сем'яў закрыты шлях у каледжы і універсітэты. Таму доля дзяцей рабочых і сялян сярод студэнтаў складае ў ФРГ 15%, Францыі — 12%, а ў Японіі, Італіі, Швецыі і іншых краінах яна яшчэ меншая. Для параўнання скажам, што сярод студэнтаў Гомельскага дзяржуніверсітэта больш палавіны — дзеці рабочых і сялян.

Перад маладымі грамадзянамі заходніх краін, выхадцамі з сем'яў з нізкімі і нават сярэднімі даходамі, паўстае і іншая перашкода на шляху да вышэйшай адукацыі. Гэта — высокая аплата за навучанне. У ЗША за апошнія 20 гадоў яна павялічылася ў 3,5 раза, а ў 1985—1986 навучальным годзе ўзрасце яшчэ на 7%. Штогадовая плата за навучанне складае тут 8—9 тысяч долараў, а ў такіх прэстыжных ВНУ, як Прынстанскі універсітэт — 10 тыс., Масачусецкі тэхналагічны інстытут — звыш 20 тыс. долараў. Поўны курс навучання ў апошнім з іх або, напрыклад, у Бенінгтонскім каледжы абыходзіцца ў 170 тысяч долараў. Адсюль зразумела, каму па кішэні такія расходы.

Усё пазнаецца ў параўнанні. Прытрымліваючыся гэтага правіла, закранем такое важнае пытанне студэнцкага жыцця, як жыллё і стыпендыя. Для савецкага студэнта, які атрымлівае стыпендыю за добрую (а бывае і не вельмі добрую) паспяховасць, будзе, верагодна, цікава даведацца, што ў ЗША толькі шостая частка студэнтаў атрымлівае дзяржаўную стыпендыю, у Японіі — кожны пяты, у Францыі — кожны сёмы студэнт. Месца ў інтэрнаце абыходзіцца вельмі дорага. Напрыклад, для студэнта Х'юстанскага універсітэта (ЗША) яно каштуе амаль 2 тысячы долараў у год. Прыватнае жыллё яшчэ больш дарагое. За пакой у камунальнай кватэры трэба плаціць 170 долараў у месяц, за аднапакаёвую кватэру без выгод — 220 долараў. Каб закончыць ВНУ, многія выкарыстоўваюць своеасаблівую сістэму пазык: студэнт заключае дагавор з банкам, які штомесячна выдае яму пэўную суму, па заканчэнні вышэйшай школы малады спецыяліст абавязаны выплаціць банку атрыманую ім суму з працэнтамі. Нягледзячы на гэта, не кожнаму ўдаецца атрымаць дыплом. У ЗША, напрыклад, кожны чацвёрты студэнт не ў стане закончыць ВНУ з-за матэрыяльных цяжкасцей. З тых жа 75%, каму гэта ўдаецца, многія сутыкаюцца з новай, бадай, больш вострай праблемай: беспрацоўем. У ЗША каля 1,3 мільёна выпускнікоў ВНУ не маюць работы. У Францыі не могуць знайсці па спецыяльнасці толькі 30 з кожнай сотні маладых спецыялістаў з вышэйшых адукацыяй. Канешне, гэта праблема не закранае выпускнікоў так званых «прэстыжных», нярэдка прыватных навучальных установаў. (Гарвардскі і Прынстанскі універсітэты, Масачусецкі тэхналагічны інстытут у ЗША, Оксфард і Кембрыдж у Вялікабрытаніі, універсітэт Васэда ў Японіі). Іх чакаюць важныя пасады ў эканоміцы і палітыцы сваіх краін. Але нагадаем, хто яны, выхаванцы гэтых дорага каштуючых навучальных установаў? Вось адзін толькі факт: дзеці багатых бацькоў, выпускнікі платных прыватных школ, складаючы ў Вялікабрытаніі 4% вучняў, займаюць 65% месц у Оксфардскім і Кембрыджскім універсітэтах і яшчэ 25% месц у астатніх універсітэтах краіны. Такая ж сітуацыя і ў іншых капіталістычных дзяржавах.

Такім чынам паўстае дылема: ракеты ці школьныя падручнікі? Праграма касмічных узбраенняў ці стыпендыі студэнтам? Гэтыя пытанні ўсё больш настойліва ўзнімаюцца дэмакратычнай грамадскасцю Захаду. Але ва ўмовах, калі прыкладна палавіна нацыянальнага багацця належыць верхнім 2—3% насельніцтва, гэтыя пытанні вырашаюцца на карысць ваенна-прамысловага комплексу. Фабрыкантам зброі не да нацыянальных інтарэсаў.

**Р. ЛАЗЬКО,**
загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі, дацэнт.

**А. БРОЎКІН,**
асістэнт кафедры.

## СВАБОДУ ПАТРЫЁТУ!

У адным з нумароў газеты «Комсомольская правда» надрукавана паштоўка пратэсту «Свабоду Л. Пелціеру!» Гэта было зроблена з мэтай збору подпісаў камсамольцаў, піянераў, усёй моладзі Савецкага Саюза ў абарону барацьбіта за правы індзейцаў Амерыкі Леанарда Пелціера, які з-за беззаконных дзеянняў правасуддзя ЗША пакутуе ў турме. Ён прыгавораны да двух тэрмінаў пажыццёвага зняволення.

У СССР сабраны ўжо сотні тысяч паштовак пратэсту з подпісамі камсамольцаў і моладзі, якія патрабуюць неадкладнага вызвалення патрыёта. Яны накіраваны ў адрас Белага дома ў Вашынгтоне.

Мы, студэнты групы Ф-26 фізічнага факультэта, таксама паставілі на паштоўках пратэсту свае 28 подпісаў у абарону Леанарда Пелціера. Далучыла свой голас і наш куратар дацэнт Л. Х. Антропава.

Звяртаемся да ўсіх студэнтаў універсітэта з заклікам сабраць свае подпісы ў абарону барацьбіта за правы амерыканскіх індзейцаў Л. Пелціера.

**А. СТРЫЖНЕЎ,**
студэнт групы Ф-26 фізічнага факультэта.

## ВЫКАРЫСТАННЕ ЭВМ



НА ЗДЫМКУ: студэнткі 4-га курса Т. Гільяшэнка, С. Медзвядкова, А. Бондарава, Г. Бяляцкая каля экрана працуючай мікра-ЭВМ.

Фота Н. Кір'янавай.

**У пошуках шляхоў павышэння якасці навучання важнае месца адводзіцца даследаванням па выкарыстанню аўтаматызаваных навучаючых сістэм (АНС) і дзелавых гульняў у вучэбным працэсе.**

АНС павінны рэалізоўваць такія функцыі як навучанне, кансультацыя, праверка ведаў. Дзелавыя гульні — гэта своеасаблівае мадэліраванне працэсаў і механізмаў упраўлення. Іх навучаючае дзеянне забяспечваецца перш за ўсё тым, што імітацыя працэсаў упраўлення ажыццяўляецца з удзелам саміх ігракоў, дазваляе ім убачыць непасрэдна або ў адлюстраванай форме вынікі сваіх дзеянняў.

З мэтай стварэння і прымянення аўтаматызаваных навучаючых сістэм у верасні мінулага года на кафедры АМАЭІ была створана група праектавання. У яе ўвайшлі студэнты 4-га курса спецыяльнасці «Арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі». Вынікі даследаванняў і праектавання завяршыліся рэалізацыяй сцэнарыяў дыялогу па наступных тэмах курса: «Тэорыя гульняў і даследаванне аперацый», «Метады рашэння стратэгічных гульняў» (студэнткі Г. Бяляцкая, Н. Курылава); «Мадэлі ўпраўлення запасамі» (студэнтка С. Медзвядкова); «Асноўныя элементы сістэм масавага абслугоўвання» (студэнтка А. Бондарава). Была праведзена дзелавая гульня на мікра-ЭВМ «Заказ на матэрыялы» (студэнтка Т. Гільяшэнка), якая імітавала дзейнасць падраздзялення, што забяспечвала планаванне і арганізацыю матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння.

Створаныя на базе мікра-ЭВМ «Электроніка-60» сістэмы дазваляюць праверыць засваенне тэарэтычнага матэрыялу вывучаемай тэмы, правільнасць асноўных формул, разліку, рашыць канкрэтную задачу па разглядаемай тэме, ацаніць веды, зыходзячы з правільнасці адказаў на пытанні, замацаваць і актывізаваць навыкі работы з ЭВМ.

Створаныя сістэмы знайшлі прымяненне пры правядзенні практычных заняткаў і ў самастойнай рабоце студэнтаў. У далейшым будзе пашырацца тэматыка работ па стварэнню навучаючых сістэм і дзелавых гульняў для іншых тэм курса.

**В. КЛЫГА,**
асістэнт кафедры АМАЭІ, кандыдат эканамічных навук.

